# УСТАУНАЯ ГРАМАТА ДА НАРОДАУ БЕЛАРУСІ.

У часе сусьветнай вайны, што бурыць адны моцные дзержавы і аслабаняе другіе, абудзілася Беларусь да дзержаунаго жыцця. Пасьля трох съ паловаю вякоу і няволі ізноу на увесь сьвет кажа беларускі народ аб тымъ, што ен жыве і будзе жыць. Вялікі Народны Збор—Усебеларускі Зьезд 5 –17 сьнежня 1917 року, дбаючы аб долі Беларусі, зацьвердзіу на яе землях рэспубліканскі лад. Выпауняючы волю Зьезду і баронючы дзержауные правы народу, Спауняючы Камітэт Рады Зьезду гетак пастанауляе аб дзержаунвым устрою Бѣларусі і аб правох і вольнасьцях яе грамадзян і народау:

1. Беларусь у рубяжох разсялення і лічбеннай перавагі беларускаго народу абвешчаецца Народнаю Рэспублікай.
2. Осноуные законы Беларускай Народнай Рэспублікі зацьвердзіць Установчы Сойм Беларусі, склікваны на асновах агульнаго, роунаго, простаго, патаемнаго і прапорцыянальнаго выборчаго права, ні зважаючы на пол, народнасьць і рэлігію.
3. Да часу, пакуль зьбярэцца Установчы Сойм Беларусі, законодаучая улада у Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускаго Зьезду, дапоуненай предстаунікамі нацыянальных меньшасьцяу Беларусі.
4. Спауняючая і адміністратыуная улада у Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Народнаму Сакратарыяту Беларусі, які назначаецца Радаю Зьезду і перадъ ею трымае атвет.
5. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі абвешчаецца вольнасьць слова, друку, сходау, забастовак, хаурусау; безумоуная вольнасьць сумленьня, нізачэпнасьць асобы і памешкання.
6. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі усе народы маюць права на нацыянальна-пэрсональную аутаномію; абвешчаецца роунае права усіх мовау народау Беларусі.
7. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі права прыватнае уласнасьці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца бяз выкупу тымъ, хто самі на ей працуюць. Лясы, вазеры і нутро зямлі абвешчаюцца уласнасьцю Беларускай Народнай Рэспублікі.
8. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі устанауляецца найбольшы 8-і гадзінавы рабочы дзень.

Абвешчаючы усе гэтые правы і вольнасьці грамадзян і народау Беларускай Народнай Рэспублікі, мы, Спауняючы Камітэт Рады Зьезду, абавязуемся пільнаваць законнаго парадку жыцця у Рэспубліцы, сьцерагчы інтарэсау усіх грамадзян і народау Рэспублікі і захаваць правы і вольнасьці працоунаго люду. А так сама даложым усіх сілау, каб склікаць у найбліжэйшым часі Установчы Сойм Беларусі.

Усіх верных сыноу Беларускай зямлі клічам памагчы нам у цяжкой і атветнай нашай працы.

**Спауняючы Камітэт Рады І-го Усебеларускаго Зьезду.**

Выдана у Мінску Беларускім 9 сакавіка 1918 року.

---

Устаўная Грамата Выканаўчага Камітэту Рады Першага Ўсебеларускага Зьезду за 9.03.1918 (дак. №0101)